УДК 39(=161.3):272-4

*В. І. РАМАНЕНКАВА*

# КАМПАНЕНТЫ РЭЛІГІЙНА-БЫТАВОЙ ТРАДЫЦЫІ Ў РЫМСКА-КАТАЛІЦКАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

*Рэлігійна-бытавая традыцыя Рымска-каталіцкай царквы базіруецца на двух, нібыта процілеглых полюсах культуры – вусным народным і кананічным царкоўным. Рэлігійна-бытавая культура ўяўляе своеасаблівы мікст кананічнага сакральнага і народнага мастацтва і выступае не толькі як культурная спадчына мінулага, але і неад'емны фактар сучаснасці. У артыкуле разглядаюцца кампаненты рэлігійнасці ў бытавым асяроддзі беларускіх католікаў.*

Сучасная культура заснавана на глыбокіх традыцыях, якія адлюстроўваюць асаблівасці творчай дзейнасці і духоўнага патэнцыялу народа, крыніцы яго жыццёвай энергіі. Рэлігійна-бытавая традыцыя патрабуе спецыяльнага кампаратыўнага даследавання праблематыкі ўзаемадзеяння двух нібыта процілеглых полюсаў культуры – вуснага, спрадвечна народнага і кананічнага царкоўнага. *Мэтай* дадзенага *артыкула* з'яўляецца выяўленне кампанентаў рэлігійнасці ў бытавым асяроддзі беларускіх католікаў.

Працэс развіцця рэлігійнай творчасці ў Беларусі цесна звязаны з адраджэннем і сцвярджэннем нацыянальнай свядомасці, аб чым шмат пішуць У. Конан, Э. Дубянецкі, Л. Уладыкоўская. Сучасныя фалькларысты, музыказнаўцы і мастацтвазнаўцы (Л. Густова, А. Зола, Л. Касцюкавец, Т. Ліхач, У. Неўдах) актыўна вывучаюць пеўчую рэлігійна-бытавую спадчыну. Характарыстыку нацыянальным духоўным музычна-пеўчым традыцыям далі Л. Баранкевіч, Л. Густова, Л. Касцюкавец [1; 3; 4].

Паводле расійскага этнолага і сацыёлага С. Лур'е, традыцыя – гэта штосьці, што знаходзіцца ў пастаянным працэсе змены як малой, так і глабальнай, звязанай са зменамі ў грамадстве. У традыцыі прысутнічае як крэатыўны складнік, так і кансерватыўны. Характар змяненняў у традыцыйным грамадстве не самавольства, ён зададзены традыцыяй знутры [6, с. 42]. Такім чынам, можна сцвярджаць, што рэлігійная бытавая традыцыя – гэта адзінка, якая пастаянна змяняецца, убірае ў сябе культурныя здабыткі мінулых пакаленняў і выпрацоўвае ўласныя каштоўнасці.

Найбольш відавочна ўзаемапранікненне народнай бытавой культуры і хрысціянства (у большай ступені каталіцызму і праваслаўя) на грунце спрадвечных традыцый і вераванняў папярэдніх часоў. Сучасныя навукоўцы (У. Конан, Э. Дубянецкі) [3, с. 474] для характарыстыкі з'явы такога роду выкарыстоўваюць тэрмін «сінкрэтызм», што азначае шчыльнае перапляценне хрысціянскіх рэлігійных уяўленняў з больш старажытнымі – язычніцкімі (сістэма рэлігійных культаў, у якіх адухаўляліся навакольныя рэчы і з'явы).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Можна вылучыць некалькі кампанентаў рэлігійна-бытавой традыцыі ў культуры беларускіх каталікаў: мастацка-матэрыяльны (архітэктура, скульптура, жывапіс і інш.), моўна-паэтычны (загаворы, варажэнне і інш.), музычна-паэтычны (духоўныя вершы, рэлігійныя песні, канты) і сацыяльна-бытавы (святы і абрады).



Мастацка-матэрыяльны кампанент рэлігійна-бытавой традыцыі шырока прадстаўлены архітэктурным і скульптурным мастацтвам. Напрыклад, цікавая архітэктурная кампазіцыя XVIII ст. знаходзіцца на тэрыторыі былой в. Валасатка Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці. Кампазіцыя складаецца з маленькай драўлянай капліцы і драўлянага крыжа, што месціцца крыху наводдаль ад капліцы. Пабудова тыпова бытавой канструкцыі: драўляная, акруглая, з каменным падмуркам і дахам у форме конуса, які завяршаецца крыжам. Капліца была створана мясцовымі жыхарамі як абярэг ад напаткаўшай іх бяды – чумы. Дэкарыравана капліца драўляным распяццем і дзвюма драўлянымі скульптурамі па баках крыжа. Дакладна невядома постаць святога, які знаходзіцца па правым боку Хрыста. Але, калі разглядаць адзенне скульптуры (сутана і галаўны ўбор святара), атрыбутыку (крыж, кніга) і ўлічваць прычыны пабудовы капліцы, то можна з упэўненасцю сцвярджаць, што гэта постаць Яна Непамука (каля 1350–1393). У бытавой культуры каталікаў і праваслаўных Чэхіі, Польшчы і Беларусі святы выступае заступнікам ад розных напасцяў. Злева ад крыжа знаходзіцца фігура Святой Дзевы Марыі. Капліцу і сёння наведваюць вернікі, якія клапоцяцца аб стане яе захавання.



На святы капліцу ўпрыгожваюць належным чынам. Калі свята праваслаўнае, то фігуры ўбіраюць у спецыяльныя адзенні з праваслаўнымі крыжамі, калі каталіцкае – то з каталіцкімі крыжамі.



Хрысціянскія рэлігійныя матывы занялі цэнтральнае месца ў жыцці і творчасці Аляксандра Аляксандравіча Калбасіча (1925–2010) (в. Варганы Докшыцкага раёна Віцебскай вобл.). Усё жыццё ён вырабляў каменныя скульптуры на рэлігійныя тэмы, якія размясціў у панадворку і прыдарожнай тэрыторыі каля сваёй хаты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Моўна-паэтычны кампанент рэлігійна-бытавой традыцыі праяўляецца ў славесных формах, такіх як малітоўныя загаворы[1]. Паводле візітацыйных[2] дакументаў 1782 г., зафіксаваных на тэрыторыі Докшыччыны (Віцебская вобл.), ведаем, што ў паўсядзённым жыцці некаторых католікаў пануюць моцныя хрысціянскія традыцыі, якія цесна сутыкаюцца з больш раннімі старажытнымі вераваннямі славян. Візітатар піша: «У вёсцы Кублічы спаткаў асоб, якія славіліся па ўсёй навакольнай тэрыторыі тым, што “загаворвалі” ваду для хворых, і той вадой лячылі»[3]. У загаворах маглі выкарыстоўвацца звароты да хрысціянскіх святых і малітвы.

Музычна-паэтычны кампанент рэлігійна-бытавой традыцыі найбольш яскрава праяўляецца непасрэдна ў самім рытуале і, вядома, у бытавой музычнай дзейнасці (песні, музыка, танцы і г.д.). Каятан Ражноўскі[4] піша ў дзённіку аб роднай вёсцы, якая знаходзіцца ў Докшыцкім раёне: «Калі прыязджаў да бабулі з дзядулем на канікулы, заўсёды меў магчымасць пачуць гадзінкі[5] на світанні. Спявалі іх сола і на галасы. І потым на працягу ўсяго дня падчас працы спяваліся рэлігійныя песні» [9]. Крысціна Іванаўна Зінкевіч (1936) – парафіянка Рымска-каталіцкай царквы ў г. Докшыцы Віцебскай вобласці таксама зазначае, што рэлігійныя песні ў іх сям’і панавалі заўсёды. Сёння жанчына шмат спявае як у касцёле, так і дома, і пераважна песні рэлігійныя, бо толькі іх ведае на памяць. Часцей за ўсё бытавыя рэлігійныя спевы гучаць на Каляды і Пасху, калі выконваюцца валачобныя абрады. Жыхары в. Валкалаты Віцебскай вобласці – Ганна Антонаўна Шылько (1923), Калета Іванаўна Кацейка (1936), Марыя Уладзіміраўна Сіўчак (1931) распавядаюць, што валачобнікі і калядоўшчыкі прыносяць у дамы дабро і шчасце, за гэта гаспадары іх узнагароджваюць. Валачобнікі спяваюць песні ў асноўным «жычыннага» (жычэнні – пажаданні) характару («Добры вечар, Паненачка», «Добры вечар табе», «А на моры тонка кладка» і інш.) і прыгаворваюць: «Віншуем і віншуем, і віншаваць не перастанем, пакуль падарка не дастанем»; «Хазяйка заблудзі тэй сцежкай, дзе стаіць сала з дзежкай». З праведзеных намі апытанняў мясцовых жыхароў вынікае, што ўсе святочныя дзеянні носяць характар тэатра-

[1] Тэкст загавору запісаны ў жніўні 2010 г. ад жыхаркі в. Варганы Веранікі Сіўко: «Ангел мой, спасіцель мой, ты наперадзе, а я за табой, а ты Божа Маці – ля стала, а ты, Гасподзь, дай мне лёгкасці, а дактарам скорасці, і ты, Хрыстос, знімі мяне са стала, як цябе здымалі з крыжа. Крыж у руках, Божа Маці ў вачах, Ангел мой наперадзе».

[2] Візітацыя (ад лац. videre – бачыць) – агляд асобамі, якія валодаюць уладай, дзейнасці даручаных ім устаноў і тэрыторый. Гэты сродак нагляду атрымаў асаблівае развіццё ў асяроддзі хрысціянскай царквы [7, с. 401].

[3] Wizytacja Dekanatu Połockiego r. 1782 [8, с. 12].

[4] Ражноўскі Каятан (пол. Kajetan Rożnowski, 1888–1965) – удзельнік Варшаўскай бітвы (1920), мясцовы актывіст урада на Зямлі Віленскай, у 1922 г. пасол у віленскім парламенце, мэр мясцовасці Падбродзе (Podbrodzie) у 1928–1932 гг., мэр Куцэвіч (Kucewicz) у 1935–1939 гг. [10, с. 7].

[5] Гадзінкі (пол. Godzinki) – літургічная малітва ў Рымска-каталіцкай царкве, звычайна мае характар просьбы аб заступніцтве. Складзена гэта малітва згодна з гадзінамі брэвіярыя (кніга з малітвамі на кожную гадзіну), але не з’яўляецца часткай пагадзіннага набажэнства і звычайна ажыццяўляецца на працягу дня, незалежна ад гадзіннага падзелу.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лізацыі (музыка, песні, прыгаворкі, ролевы падыход – гаспадары і калядоўшчыкі, пераапрананне ў жывёл і інш.).

Сацыяльна-бытавы кампанент складаюць сямейна-бытавыя святы і абрады, у тым ліку пахавальны абрад. У народнай пахавальнай традыцыі прысутнічае шмат абрадавых дзеянняў, якія звязаны з інстынктам самазахавання як індывідуальнага (асабовага), так і сацыяльнага (сямейнага). Тут маюцца на ўвазе ўмоўныя правілы, якіх людзі стараюцца прытрымлівацца, каб не зашкодзіць пераходу душы памерлага, ці не наклікаць смерці іншага чалавека з сям'і. Цэнтральнымі постацямі на пахаванні становяцца так званыя пеўшыя – людзі, якія спяваюць і моляцца на пахаванні (назва зафіксавана на тэрыторыі Докшыцкага раёна Віцебскай вобл.). У абавязкі пеўшых уваходзяць спеў рэлігійных жалобных песень і чытанне спецыяльных малітваў. Лічыцца, што гэтыя людзі праз малітву спрыяюць хуткаму і лёгкаму адыходу на той свет душы памерлага. Рэпертуар жалобных спеваў у Беларусі складаюць песні рэлігійныя і фальклорныя, якія паэтычным зместам узмацняюць пачуцці смутку, пакуты. Гэта свайго роду псіхалагічны метад, які дапамагае чалавеку не трымаць боль, але дазваляе збалансаваць узровень пачуццёвага тону. Сучасная даследчыца доктар Э. Кюблер-Рос (ЗША) піша: «Слёзы, як цяпер вядома, утрымліваюць анестэзаваныя рэчывы, дзеянне якіх падобна да дзеяння марфіну. Гэта значыць, што "рыданні" сваякоў – гэта, хутчэй, не спроба выклікаць да сябе жаль і абараняцца гэтым жалем ад астракізму багоў, а фізіялагічная рэакцыя арганізма, якая змякчае душэўны боль» [5, с. 184]. Каталіцкія святары звяртаюць увагу на тое, каб пеўшыя стараліся спяваць на пахаванні больш песень каталіцкіх кананічных («Odchodzi dusza do wieczności», «Дзень той гневу»), а не фальклорных («Памінайце ўсе радныя», «Жизнь страшна, а смерть ужасна», «Zmarły człowiecze»). Стаўленне святароў да кананічных тэкстаў абумоўлена тым, што для фарміравання рэлігійна-духоўнага кірунку думак і пачуццяў неабходнай з'яўляецца форма звароту да Усявышняга з дапамогай кананічных рэлігійных тэкстаў, а не фальклорных, у якіх вельмі часта назіраюцца скажэнні рэлігійнай рэчаіснасці.

Рэлігійна-бытавая традыцыйная рымска-каталіцкая культура мае канкрэтныя функцыі. Эстэтычная функцыя забяспечвае артэфакту магчымасць служыць крыніцай эстэтычнай інфармацыі (музыка, спевы, тэатралізацыя). Аксіялагічная адлюстроўвае здольнасць абраду фарміраваць у асобнага чалавека, калектыву людзей каштоўнасныя арыентацыі аб традыцыйнай культуры. Дыдактычнасць выяўляецца ў магчымасці фальклорнай абраднасці перадаваць адвечныя імкненні народа да дабра і праўды, святла і шчасця. Традыцыйныя маральныя ідэалы выхоўвалі і выхоўваюць шматлікія пакаленні. Антрапалагічная функцыя заключаецца ў тым, што практычна ўсе гістарычныя змены ў чалавечай свядомасці, развіцці культуры і росце ведаў адбіваюцца ў тэкстава-лексічнай сістэме (мы маем на ўвазе тэксты песень). І, нарэшце, абрады дапамагаюць захаваць культурна-гістарычную сувязь паміж пакаленнямі, забяспечваюць унутранакультурную пераемнасць.

Падводзячы вынікі, можна сцвярджаць, што рэлігійна-бытавая рымска-каталіцкая культура – гэта развітая мастацкая сістэма, заснаваная на глы-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

бокіх традыцыях мінулых часоў і на распрацоўцы біблейскіх, хрысціянскіх і дахрысціянскіх архетыпаў у кантэксце актуальных жыццёвых праблем, народных ідэалаў. Кампаненты рэлігійна-бытавой традыцыі – гэта шырокае кола вытокаў, разнародных па сваім характары і спосабе бытавання, – абрады, вераванні, фальклор, якія ўключаюць усе віды мастацкай творчасці – песні, музыку, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, тэатралізаваныя дзействы і інш. Закладзеныя ў рэлігійна-бытавой традыцыйнай культуры высокая духоўнасць і маральнасць выступаюць гарантамі гарманізаванай арганізацыі духоўнага ўкладу грамадства, павагі да традыцый.

1. *Баранкевич, Л. Ф.* Белорусские духовные стихи о Лазаре / Л. Ф. Баранкевич // Вес. Беларус. дзярж. акад. музыкі. – 2005. – № 6. – С. 79–88.
2. *Густова, Л.* Музыкально-певческая культура Православной церкви Беларуси / Л. Густова. – Минск : Бестпринт, 2006. – 169 с.
3. *Дубянецкі, Э. С.* Рэлігійныя вераванні / Э. С. Дубянецкі // Беларускі фальклор : энцыкл. : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2006. – Т. 2 : Лабараторыя традыцыйнага мастацтва – «Яшчур». – 768 с.
4. *Костюковец, Л. Ф.* Кантовая культура в Белоруссии / Л. Ф. Костюковец. – Минск : Выш. шк., 1975. – 96 с.
5. *Кюблер-Росс, Э.* О смерти и умирании / Э. Кюблер-Росс. – СПб. : Наука, 2001. – 320 с.
6. *Лурье, С. В.* Историческая этнология : учеб. пособие для вузов / С. В. Лурье. – М. : Аспект Пресс, 1997. – 624 с.
7. *Цыпин, В.* Визитация / В. Цыпин // Православная энциклопедия : в 30 т. – М. : Православная Энциклопедия, 2004. – Т. 8. – С. 401–403.
8. Wizytacja Dekanatu Połockiego r. 1782–1784 // Lietovos Valstybes Istorijas Archyvas. – IAW sygn. 694-1-3487.
9. *Rożnowski, K.* Pomiętnik / K. Rożnowski [Electronic resource]. – Mode of access: file://localhost/D:/Polska/Praca/KAJETA~1.MHT. – Date of access: 22.02.2013.
10. Sejm Wileński 1922: przebieg posiedzeń według sprawozdań stenograficznych w opracowaniu kancelarji sejmowej. – Wilno : Księgarni Józefa Zawadzkiego, 1922. – 201 c.

*V. RAMANENKAVA*

**COMPONENTS OF THE RELIGIOUS AND HOUSEHOLD TRADITIONS IN THE ROMAN AND CATHOLIC CULTURE OF THE BELARUSIANS**

*Religious and household tradition of the Roman Catholic Church is based on two supposedly opposing poles of culture – oral native folk and the canonical art. Religious and household culture is a kind of «mix» of canon sacred and folk authentic arts, and acts not only as a cultural heritage of the past, but also as an integral factor of the modernity. The article describes the components of the religiosity in the household culture of the Belarusian catholics.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 27.03.2013.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ